Самапомач Самаромаў

Беларуская Коопэратыўна-Гаспадарчая Часопісь

Год III. | Вільня, Чэрвень 1934 г. | № 6.

Хай злыдні над намі,
скрыгочуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!..
ЯНКА КУПАЛА.

Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапомачу.

Джордж РЭСС ЭЛЬ
(Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ № 6 (23).

Ceny ŭ Vilni.

CENY. Zbožža za 100 kilo:	20.VI.34 h.
Žyta I	14.70—14.75.
Žyta, II	14.55—14.50
Pšanica	19.50 - 22 00
Jačmień	19.00—
Avios, niezamočany	16.50 - 17.50
Pšaničnaja muka, 4/0.	34.50 - 37.50
Žytniaja muka 65 prac.	— 20 00
Žytniaja muka, 55 prac.	—25 00
Žytniaja muka sitkovaja	18.00—18.50
Žytniaja muka razovaja	18.00—18 50
Hrečka	19.50—20.00
Siena	4 00— 4.50
Bulba	3·50— 4.50

Miasny rynak, 19.VI.34. za 1 kilo:

Vałovina, całyja štuki, II i III hat.	0.70— 0 85
Vałovina, zady, I i II hat.	0.90— 1.10
Vałovina, pierady, (košer) I i II hat.	1 00— 1.20
Cialacina, II i III hat.	0 60— 0.80
Švinina, I hat.	1 00— 1.10
Skury bydlačyja, syryja za 1 kilo	0 90— 0.95
Skury cialačyja, za štuku	3.50— 4.00

Drobiaź, 19.VI.34.

Jajki, dziesiatok	0.50—0.70
Śmiatana, litr	0.70 0.90
Paziemki, klh.	0.80 - 1 00
Truskaŭki, klh.	0 60 0.90
Kalafiory, štuka	0,30—0.50
Sałata, kust	0.05
Bulba świežaja, klh.	0.15 0 20
Ahurki z inspektu, štuka	0.15—0.25
Raki, za 10 štuk	0.30

Hrošy, 20 VI 34.

Rubiel zołatam, u 5-rubloŭcy	4.61
„ „ u 10-rubloŭcy	4.65

Samapomač

BIEŁARUSKAJA KOOPERATYŪNA-HASPADARČAJA ČASOPIŚ.

Adres:
VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

Самапомач

Hod III.	Vilnia, Červień 1934 h.	Nr. 6 (23).

KOOPERATYŪNYJA NAVINY.

Važniejšyja źmieny ŭ kooperatyŭnym zakonie.

(Dz. U. R. P. Nr. 38, poz. 342, 1934).

1. Sud rejestruje statut tolki takoj kooperatyvy, jakaja pradstavić paśviedčańnie Kooperatyŭnaj Rady (abo Reviz. Sajuzu) ab „pravametnaści zasnavańnia kooperatyvy, a taksama što haspadarčaja dziejnaść, jak jana pakazana ŭ statucie, nie nasuvaje zaściarohaŭ“.

2. Kooperatyva (ŭsiakaha vidu) biaz sumysnaj zhody Ahulnaha Schodu maje prava vydać kredytu svajmu siabru najvyšej u dziesiać razoŭ bolš, čym jon zapłaciŭ u dadzienuju kooperatyvu na rachunak paju. Usie kooperatyvy musiać zastasavacca da hetaha vymahańnia najpaźniej da kanca siol. 1934 h.

3. U zajavie ab prystupleńni ŭ siabry kooperatyvy zamiest dnia prystupleńnia padajecca dzień padpisańnia zajavy.

4. Paviedamleńni ab vyklučeńni siabry z kooperatyvy možna padavać vyklučanamu asabista, pad jahonuju raśpisku.

5. Siabra moža vystupić z kooperatyvy najpaźniej za 6 miesiacaŭ pierad raźviazańniem kooperatyvy.

6. Dabravolna raźviazanaja kooperatyva moža ŭznavić svaju dziejnaść, kali najpaźniej za hod pa pastanovie ab raźviazańni, siabry kooperatyvy na Ahulnym Schodzie prymuć uznaŭlajučuju pastanovu bolšaściu $^3/_4$ hałasoŭ.

7. Pastanovy Ahulnych schodaŭ pravodziacca bolšaj pałavinaj usich a d d a d z i e n y c h hałasoŭ. Dahetul vymahałasia bolšaść „prysutnych“; znača ciapier chto ad hałasavańnia ŭstrymajecca, toj jak-by susim na schodzie nia byŭ.

8. Kooperatyva moža być vykasavanaj z rejestru biez likvidacyjnaha pastupańnia ŭ dvuch vypadkach: a) kali ad svajho zasnavańnia nie pačynała haspadarčaj dziejnaści i b) kali pačatuju haspadarčuju dziejnaść prarvała bolš jak na 5 hadoŭ i nia maje nijakaj majemaści.

9. Uprava kooperatyvy pad hroźbaj kary najpaźniej za miesiac paśla kožnaha Ahulnaha Schodu musić pasyłać kopiju pratakołu ŭ Koop. Radu abo ŭ Rev. Sajuz.

10. Knihi i rachunki kooperatyvy musiać stała znachodzicca ŭ pamieškańni kooperatyvy i vydać ich kamu kolečy možna tolki na damahańnie Sudu.

11. U siabry Nahladnaj Rady, taksama jak i ŭ siabry Upravy moža być vybrana tolki asoba poŭnaletniaja — jakaja maje najmienš 21 hod.

12. U kooperatyvach, siabrami jakich źjaŭlajucca kooperatyvy i inšyja jurydyčnyja asoby (arhanizacyi), u Nahladnuju Radu možna vybrać kožnaha siabru hetych kooperatyvaŭ, a taksama p r a d s t a ŭ n i k a (a nia „kožnaha siabru“) inšaj jurydyčnaj asoby. U Upravu takoha pradstaŭnika vybirać nia možna.

Jak ciapier zasnavać novuju kooperatyvu?

Vyžejpadadzienyja źmieny zakonu ab kooperatyvach źmianiajuć dahetulašni sposab rejestravańnia samoha statutu kooperatyvy. Pierš čym pasyłać u Sud pryniaty na Schodzie statut kooperatyvy, treba dastać ad Kooperatyŭnaj Rady (abo ad Reviz. Sajuzu) „oświadczenie“.

Dziela hetaha treba pisać u Nahladnuju Radu adpaviednuju prośbu, da katoraj dadajucca: 1) dva ekzemplary (aryhinał i kopija) prajektu statutu z podpisami i dakładnymi adresami zakładčykaŭ kooperatyvy; 2) śpisak siabraŭ Nahladnaj Rady i Upravy, z zaznačeńniem imionaŭ, proźviščaŭ, zaniaćcia (čym zajmajucca) i dakładnych adresoŭ hetych asobaŭ; 3) kopii pratakołaŭ, jakija paćviardžajuć vybar Nahladnaj Rady i Upravy kooperatyvy; 4) paćvierdžańnie ab zapłačeńni sumy 15 zł. na konto Dziarž. Kooper. Rady № 30.060 u P. K. O. (na advarocie hetaha paćvierdžańnia treba ŭpisać: „opłata za oświadczenie“). Koop. Rada budzie davać svajo „oświadczenie“ na aryhinale prajektu statutu. Aryhinał hety kancelaryja Kooper. Rady budzie varočać kooperatyvie, zatrymoŭvajučy reštu dakumentaŭ u svaich aktach.

Z Zavočnaha Kursu Kooperacyi pry redakcyi „Samapomačy“.

U źviazku z letnim raźjezdam lektaraŭ Kursu na viosku, navučańnie na Kursie praryvajecca da m-ca vieraśnia.

Z Administracyi čas. „Samapomač“.

Dziela vyhady padpiščykaŭ „Samapomačy“ pry apłačvańni padpiski za minułaje i za nastupnaje paŭhodździe, da hetaha numaru časopisi dałučajecca blankiet našaha čekav. konta ŭ P.K.O. № 180.485.—Vykarystajcie jaho ŭsie!

„Śviata Praporu Ukrainskaj Kooperacyi“.

U niadzielu 3 h. m. ukrainskaja kooperacyja ładziła ŭ Lvovie vialikaje svajo «Śviata Praporu»*). Śviata heta vyliłasia ŭ ahulna-narodnuju demonstracyju ukrainskich haspadarčych sił i vyhladała, pavodle viestak kooper. presy, bolš-mienš hetak:

Pačałosia śviata ŭračystaj palovaj Słužbaj Božaj, jakuju pry 15 tysiačach prysutnych delehataŭ i haściej, na najbolšym Lvoŭskim spartovym placy „Sokała-Baćki“ adpraviŭ Preaśv. biskup N. Budka. Kančałasia ŭžo Słužba Božaja, jak ad hałoŭnaj bramy placu zatrubili truby; adkazali im fanfary (syhnał) pry kaplicy. Byŭ heta znak dla ŭsich, što pryjechaŭ na śviatkavańnie ŭsimi šanavany i pavažany Ekscelencyja Mitrapalit Andrej, jaki zaniaŭšy pry kaplicy svajo miesca paśviaciŭ sam ściah, a muzyka adyhrała hymn „Boža Vialiki Jedyny“. Zaraz paśla hetaha Mitrapalit skazaŭ vielmi hłybokuju pramovu na temu słoŭ Chrystovych „Ja nia pryšoŭ na toje, kab mnie słužyli, ale na toje, kab słužyć“ i ŭručyŭ ściah pieršamu staršyni sučasnaha „Reviz. Sajuzu Ukr. Koop.“ D-ru K. Levickamu, jaki pacałavaŭšy ściah, padziakavaŭ za paśviačeńnie i naznačyŭ šlach ukr. kooperacyi miž inš. słovami: „va ŭłasnych rukach — naša budučynia“. Paśla nastupiła hetak zvanaje „viančańnie“ ściahu: pradstaŭniki «Proświty», «Silśkoho Hospodara», „Ridnoj škoły“, „Sajuzu Ukrainok“, „Narodnoj Tarhoŭli“, „Centrasajuzu“, „Masłasajuzu“ i „Centrabanku“ — padchodzili da ściahu, pryčaplivali da jaho stužku ad svajho tavarystva i pa karotkaj pramovie adychodzili. Paviančany ściah Dr. K. Levicki ŭručyŭ sučasnamu staršyni RSUK, senataru inž. J. Paŭłykoŭskamu, a hety apošni — hałoŭnamu dyrektaru RSUK-a pasłu Astapu Łuckamu. Paśla pramovy pasła Łuckaha ŭsie prysutnyja trojčy adkazali «Słava!» i adśpiavali ukr. nacyjanalny hymn.

Uśled za hetym była padpisana Hramata i pačałasia defilada, jakuju prymaŭ Mitrapalit Andrej u asyście D-ra K. Levickaha i inž. J. Paŭłykoŭskaha. Pry hukach maršovych pieśniaŭ, vykonvanych niekalkimi arkiestrami prajšli biazlikija t-vy i ŭsie prysutnyja prad ściaham i Mitrapalitam, jaki ŭsich ich biazupynna bahasłaviŭ. Pachod defilady zamykała kolonna aŭtamabilaŭ t-va «Masłasajuz». Paśla defilady pačaŭsia kancert, a paśla zabava, jakaja praciahnułasia až da viečara.

* * *

Hetak braty našy ukraincy śviatkavali ŭstanaŭleńnie vidomaha znaku svajej bieśpiarečnaj siły — ukrainskaj kooperacyi. Radaściaj ichnaj ciešymsia i my ŭ nadziei, što i nam zaśvitaje sonca lepšaj budučyni, kali advažna i vytryvała voźmiemsia za pracu.

Koop.

*) „prapor“ heta toje, što pebiełarusku ściah.

Pierastańcie dumać ab „panskim łohkim chlebie“!

Kančajecca školny hod. Niaznačny tolki pracent biełaruskaj moładzi kančaje siaredniuju adukacyju. U našych žudasnych varunkach, kali Biełarus z-za darahoŭli nia moža pasyłać svaich dziaciej u siaredniuju škołu — heta prosta niejkija vybrancy losu. Ale i hetym vybrancam zavidavać nia prychodzicca. Adny z ich nia majuć mahčymaści vučycca dalej, druhija nia viedajuć, jakuju sabie vybrać viedu ŭ vyšejšaj škole, kab zabiaśpiečyć budučyniu sabie i być karysnym siabram našaj hramadzkaści. — Što rabić, dzie šukać vychadu?— voś pytańni, jakija ŭ spravach adukacyi pasiarod Biełarusaŭ baluča adčuvajucca nia tolki ciapier, ale adčuvacca buduć jašče vastrej u najbliżejšaj i dalšaj budučyni.

Jość nad čym pryzadumacca.

Kali daŭniej viaskovy haspadar addavaŭ svajho syna ŭ „navuku“, to kiravaŭsia prajektam vyvieści jaho ŭ pany i pry hetaj akazii pamahčy synu panavać. Časam heta ŭdavałasia i padachvočvała inšych našych bahaciejšych sialan namahać niaraz astatkami, kab choć adnaho syna „vyvieści ŭ ludzi“.

Pryšła vajna, revalucyja, źmieny hranicaŭ dziaržaŭnych, ciesnata, biezrabоćcie i toje, što ludzi nazvali kryzysam. Usio źmianiałasia na śviecie. Nie źmianiłasia tolki adno: staraśviecki sposab dumańnia. Žyćcio lacić napierad takim zavarotnym, skrucihałoŭnym bieham, što naviet toj, chto pilna pryhladajecca, nie paśpievaje ŭsiaho dahledzić, a što-ž havaryć ab našym sielaninie? Jon za prykładam dziadoŭ i baćkoŭ haspadaryć błaha i choča padaŭniejšamu adryvać syna ad ziamli, kab vyvieści jaho „ŭ pany“. Ale heta biada nia była-b jašče biadoj vialikaj, kali-b tak dumali ludzi ciomnyja. Nie. Tradycyjny sposab dumańnia, nakinuty z takoj siłaj, što nia raz ludzi nazyvajučyja siabie pastupovymi, nijak nia mohuć adkaraškacca ad staroha šablonu, adkinuć ad siabie hniliznu čužych kulturaŭ, hniliznu što pastaromu dzielić ludziej abaviazkava na panujučych i paddanych, niavolnikaŭ, słuhaŭ.

Biednyja ludzi sa skaścianiełymi dumkami! Astalisia daloka ad žyćcia, nie razumiejuć jaho i pastaromu imknulisia-b «panavać». Nia bačać, što panom niama bolej miesca pad soncam. Nia bačać, što my pierażyvajem nia kryzys zvyčajny, jaki ekanamisty nahladali kožnyja niekalki hadoŭ, a pierałomny punkt historyi, punkt, u jakim kapitalistyčny ład akančalna załamaŭsia, ale novamu ładu miesca jašče ŭstupić nia choča. My jašče jasna nia bačym, jakija akančalna formy hramadzkaści zrodziacca na razvalinach kapitalizmu, ale z taho što vidać, možna z usioj peŭnaściu ćvierdzić, što ideałam novych časoŭ, na miesca daŭniejšaj panskaj biełaručnaści, pahardy da pracy fizyčnaj i žyćcia na čužy rachunak — prychodzić pašana i kult pracy, kožnaj pracy,

niahledziačy na toje, ci čałaviek rastrasaje na nivie hnoj, ci kiruje ministerstvam. Na ŭsim śviecie čałaviectva raspranajecca z frakaŭ, krachmalnych saročak i nadziaje rabočuju bluzu. Hlańma na balšavikoŭ, fašystaŭ i hitleraŭcaŭ. Iduć jany da roznych metaŭ, ale padobnymi šlachami i pieradusim šlacham užviadzieńnia pracy da najvyšejšaj hodnaści, tej samaj pracy, jakuju, pad hipnozam niavolnicka-feodalnaha i kapitalistyčnaha ładu, siańnia jšče niekatoryja ludzi hatovy ŭvažać za hańbu.

Na pieraŭzhadavańnie staroha pakaleńnia my, Biełarusy, vialikaj nadziei pakładać nia možam. Zatoje z vieraj možam i pavinny hladzieć na moładź, što tym ci inšym sposabam zdabyvaje aśvietu. Jakimi šlachami pojdzie moładź, ad hetaha pieradusim zaležyć los biełaruskaha nacyjanalnaha i ekanamičnaha žyćcia.

Niama i być nia moža dužaha i sarhanizavanaha narodu, kali jon nia maje taho asviečanaha nasłajeńnia, jakoje viedaje čaho choča, i viadzie narod da duchovaha raźvićcia i dabrabytu. Čałaviek ciomny zaŭsiody budzie niavolnikam, bo nia znajdzie darohi da vyzvaleńnia. Voś čamu sprava biełaruskaj aśviety— heta adna z našych najbližejšych i nieadkładnych patrebaŭ.

Ale paŭstaje pytańnie: jaki pavinien vytvarycca typ našaha pracoŭnaha intelihienta, katory-b byŭ karysny, a nia škodny dla narodu? Što treba rabić, kab Biełarus atrymaŭšy aśvietu, zamiest słužyć svajej spravie, nie pajšoŭ na słužbu da čužych dy zahubiŭ tam svajo nacyjanalnaje abličča?

Heta zaležyć pieradusim ad taho, jakuju prafesyju sabie vybiare chłapiec ci dziaŭčyna, što kančajuć siaredniuju ci naviet pačatkavuju škołu, abo dabjucca peŭnaj aśviety samavuctvam. Nam, Biełarusam, latucieć ab zdabyvańni ŭradavych pasadaŭ u ciapierašnich varunkach— sprava bieznadziejnaja. Hetych pasadaŭ panujučaja nacyja nia maje navat dla svaich ludziej. Kali-ž niedzie ŭ sučasny mament, chiba-ž całoj łakajstva, Biełarus budzie ŭstrojeny na niejkaj administracyjnaj pasadzie — dla nas jon stračany. Budzie jon źviazany pa rukach i nahach inšymi, niaraz škodnymi nam zadańniami, a ŭsio jahonaje žyćcio pierapłyvie pamiž padližnictvam svajmu načalstvu, a stracham pierad utrataj pasady i emerytury. Treba heta za pamiatać dobra.

U hetym vypadku nam nie zaškodzić vykarystoŭvać dośled inšych narodaŭ. Hlańma na Žydoŭ, a tak-ža na davajennych Palakoŭ. I adny i druhija nia mieli ŭ nas administracyjnych pasadaŭ. Zatoje stvaryli silny słoj ludziej volnych prafesyjaŭ: dachtaroŭ, advakataŭ, inžynieraŭ, kooperataraŭ, handlaroŭ, pramysłoŭcaŭ i h. d. Bahacilisia, ale adnačasna bahacili i svaju nacyju i jej słužyli. Padobna dziejełasia ŭ tych novych ciapier dziaržavach nadbałtyckich, jakim adsutnaść praktyki administracyjnaj nie pieraškodziła pry pieršaj akazii stvaryć svoj ułasny dziaržaŭny aparat.

Voś čamu i moładź biełaruskaja pavinna kiravacca na placoŭki, što nia viažać, a prynamsi najmieniej viažać z łaskaj ci niałaskaj usiemahutnaj čužoj nam administracyi, dy dajuć mahčymaść mieć łučnaść z svaim narodam i dla jahonych patrebaŭ pracavać. Inšymi słavami, medycyna i prava — dla tych chto maje mahčymaść vučycca ŭ vyšejšych škołach; kooperacyja, ramiasło, handal dla tych, chto nia moža biez patentu školnaha ŭziacca da pracy.*)

Ale ci heta znača, što Biełarus maje čuracca ziemlarobstva? Naadvarot. Jašče moža celyja viaki ziemlarobstva ŭ nas budzie hałoŭnym zaniatkam dla Biełarusaŭ i pieradusim na vytvareńni typu kulturnaha ziemlaroba na Biełarusi hałoŭnym čynam možna budzie ŭ nas razbudovyvać ekanamičnaje i nacyjanalnaje žyćcio. Ale tut jakraz najpatrabniej zmahańnie sa starym dziadoŭskim śvietahladam, jaki dychtuje, što byccam nia treba aśviety, kab być ziemlarobam, što škada navuki, kali treba varočacca da baćki na rodnuju nivu. Voś tut najbolš kidajecca ŭ vočy toje nierazumieńnie, što kala nas ciapier dziejecca, nierazumieńnie, što ziemlarob intelihientny, aśviečany nia moža nikoli być źjaviščam anormalnym, ale naadvarot, budzie tym elementam, na jaki najbolš my pavinny pakładać nadziei. Zarhanizavać viosku biełaruskuju, vyrvać jaje z jarma vyzysku i ciemnaty, ŭśviedamić jaje nacyjanalna i socyjalna možna nie adarvanymi i karotkatryvałymi kličami, ale doŭhaj, padstavovaj pracaj novaha aśviečanaha pakaleńnia, što z vioski vyjdzie i na vioscy budzie pracavać, u ciesnym kantakcie z intelihiencyjaj biełaruskaj u mieście. Nakirovyvać moładź na hetyja šlachi, vybivać jej z hałovaŭ latucieńni ab «panskim łohkim chlebie» — voś najbolš bajavyja zadańni našych dzion.

Al.

---

*) da hetaha pytańnia jšče vierniemsia — r e d.

I Vy strymlivajecie

naša biełaruskaje haspadarčaje žyćcio, kali dabetul nie apłacili jšče padpiski na „SAMAPOMAČ", abo kali nie sarhanizavali adnej-adzinaj choć-by tolki dziesiatki padpiščykaŭ (hladzi 2-ju bačynu vokładki).

Kožny heta zrabić moža, možacie zrabić i Vy. Musicie tolki chacieć!

Сельская гаспадарка.

Будзем рахаваць!

Перад пачаткам новага гаспадарчага году

Наперад можна адгадаць, што не адзін чытач наш скажа на гэта „так, будзем рахаваць, абы толькі было што.“ Хто гэтак разумее гаспадарскія рахункі, хто ў іх хоча бачыць збыткоўнасьць, ці нейкае скнэрства, той найлепш паказвае, што зусім не разумее, што такое ёсьць рахунковасьць, якая яе роль у гаспадарцы наагул і ў дробнай— асабліва. Гэткае неразуменьне можна выбачыць людзём мала і нават зусім няграматным — яны пры найлепшай ахвоце нават ўсё роўна рахунковасьці гэтай весьці ня могуць. Але чым апраўдаць неахвоту да рахунковасьці тых, што хацелі-б толькі рахаваць гатовае і ніяк ня могуць зразумець патрэбу рахаваньня наперад — каб было што рахаваць пасьля у гарудох, у хлявох, у садзе і на полі? Чым апраўдаць гэтакіх?... Хіба-ж толькі неразуменьнем істоты рахунковасьці, або простым і звычайным... гультайствам. Для гэтых апошніх шкода нават і слова; наступныя некалькі ўвагаў празначаны для тых, хто маюць добрую волю, але ня ведаюць як да цэлай справы прыступіцца.—Як ніводзін ваяка ці падарожнік ня выйдзе ў дарогу бяз мапы (карты), як мараплавы ня выплывуць на мора бяз компасу, бо зблудзілі-б у дарозе нават няведама як ім ужо знанай, так і ўсякі гаспадар ня можа сягоньня гаспадарыць бяз пляну. Плян-жа гэты мусіць быць абапёрты на выніках свае собскае гаспадаркі з мінулых гадоў. Ніякія кніжкі і газэты, ніякія рады наймудрэйшых і найвучонейшых людзей ня могуць гаспадару замяніць гэтых простых запісак аб лічбовых выніках ягонай гаспадаркі. Памяць людзкая вельмі агранічаная. Найздальнейшы чалавек — колькі-ж гэтакіх ёсьць?—можа памятаць некалькі адарваных ад сябе, нічым пэўным не спалучаных цыфровых дадзеных, ды і то з часу вельмі кароткага, з прад месяца, двух, паўгоду, году... рэдка болей. Тымчасам для апрацаваньня больш трывалкага пляну гаспадараньня патрэбны цыфровыя дадзеныя з часу незраўнана шырэйшага; да таго-ж гэтыя дадзеныя мусяць быць сьціслыя і неадарваныя, а цесна спалучаныя з самай гаспадаркай: пры кожнай цыфры выніку павінна быць паясьненьне аб тым, скуль яна паўстала.

Значэньне гэтых запісак для гаспадаркі наагул даўна ўжо разумеюць промысел і гандаль. Сягоньня з сьвечкай ня знойдзеце якое-небудзь прамысловае ці гандлёвае прадпрыемства, у каторым не вяліся-б найпрасьцейшыя хоць-бы гаспадарскія*) запіскі, рахункі. І ў гэтым у значнай меры крыецца сакрэт, чаму міма ўсё, міма крызысу, міма цяжкага ліхалецьця, промысел і гандаль заўсёды лепш, мацней трымаюцца, чымся такое земляробства, якое знаходзіцца ў тых-жа варунках, але рахункаў і наагул гаспадарскіх запісак не вядзе.

Што траціць гаспадар-земляроб, які не вядзе рахункаў?

---

*) І промысел і гандаль таксама гаспадараць.

Zaciemki ab chatnim hrybie

i krychu ab budaŭlanaj technicy.

Naviazvajučy da artykułu ŭ „Samapomačy“ № 5 h. h. — „Zaraza hryba ŭ budoŭli“, lič.u patrebnym dadać nastupnaje.

Architekty nazyvajuć hety strašenny hryb— c h a t n i m hrybom, musić dziela taho, što jon asabliva ŭ chacie zahniezdžyvajecca. U chałodnych haspadarčych budynkach hety hryb nia maje siły i dziela taho jon tam nie spatykajecca. Čamu?

Voźmiem dva typy pamieškalnych budynkaŭ dla paraŭnańnia — chatu ciapierašniuju, z padłohaj i chatu daŭniejšaha typu, dzie zamiest padłohi z draŭlanych doščak, jošć hlinіany tok („ziamla“).

Padrub — pieršy vianok — u chacie z hlinianym tokam apirajecca bespasiaredna na syroj ziamli, biaz fundamentu draŭlanaha, abo na padmuroŭku z kamienia. Padrub dziesiatkami hadoŭ, reŭna-ž, niščycca, padhnivaje pamału, chata asiadaje, robicca nižejšaj, jak-by ŭrastajučaj u ziamlu, a chatniaha hryba — niama. Čamu? A voś čamu: u chacie takoha typu ścieny z dvuch bakoŭ — ad chaty i ad panadvorku — majuć poŭny dostup pavietra, jakoje nia tolki nie dapuskaje pajavicca hrybu, ale navat, kali-b biarvieńni mieli ŭ sabie zarazu hryba jašče ŭ lesie, na pniu, što časam zdarajecca—dyk volnaje pavietra hety hryb źniščyć, a dreva staniecca volnym ad zarazy hryba.

A ciapier pryhledzimsia da chaty z padłohaj z draŭlanych doščak. Chatni hryb pajaŭlajecca tut badaj vyklučna pad padłohaj, źjadajučy jaje daščentu. Nie ŭstajać tak-ža i ścieny, asabliva kali jany buduć zakryty tynkam ad dostupu volnaha pavietra choć-by z adnaho tolki boku: pad tynkam hryb zachopić usie ścieny i stol, a tady nia budzie ratunku, usia chata za niejki hod-dva — ssuniecca, jak-by z pažaru.

Dreva jak materjał budalaŭny—ŭ svajej istocie nadta dobry; z jaho chata: i ciopłaja, i suchaja, i pryhožaja, a tak mocnaja, što mahła-b stajać jak zvon — sotni hadoŭ; bo-ž budučy stała ŭ miejscy suchim, abo naadvarot— pad vadoj, nia maje vieku.

Перадусім такі гаспадар ня ведае, што ён мае і тым самым, ня можа ведаць, кудой мае сваю гаспадарку кіраваць. Такі гаспадар ня можа ані ў прыблізнасьці прадбачыць сваіх ураджаяў, ён нават ня ведае колькі, дзе і якое мае поле. Ня ведае, колькі выходзіць у ягонай гаспадарцы ўсякага дабра; ня ведае дойнай вартасьці сваіх кароў, ня ведае, колькі ў год з усей гаспадаркі мае даходу і колькі расходу. Адным словам гаспадар без рахункаў і наагул без гаспадарскіх запісак чуецца „як у лесе" або сярод цёмнай начы: ён ня толькі кожны рух робіць вобмацкам, але найчасьцей наагул гэтых гаспадарчых „рухаў" выконываць ня можа; прынамсі ня ведае што мае рабіць, каб пазбыцца тых няўдачаў, якія яму ў гаспадарцы дакучаюць: ня ведае, ці вінавата гэтаму карова, ці сьвіня, ці неадпаведная гаспадарка ў полі ці ўрэшце няўмелае распараджэньне атрымоўванымі даходамі.

Без усяго гэтага можна было йшчэ неяк гаспадарыць у даўнія часы, калі земляробская гаспадарка была замкнёнай сама ў сабе, самавыстарчальнай, *незалежнай ад рынку*. З таго часу аднак, як уся гаспадарка людзкая з—земляробствам уключна—пачала працаваць для рынку, на грошы, ад таго чаго зьявілася няўхільная патрэба і рахункаў. Бо гаспадарачы грашыма чалавек мусіць канешна рахаць. І то ня раз за год, за месяц, за тыдзень, але кожны дзень, стала!

Рахунковасьць можа быць розная, лёгкая да правядзеньня і цяжэйшая. Для гаспадаркі земляробскай, асабліва для дробнай, досыць рахунковасьці хоць-бы найпрасьцейшай, у каторай былі-б толькі зазначаны: пачаткавы або аснаўны стан маемасьці, дапаўняны пасьля штодзеннымі зацемкамі аб прыходзе і расходзе і просты і прыклад як аблічаць гаспадарскі даход.

Кажуць, што ўсякі пачатак цяжкі. Але праўда і тое, што нічога само ня робіцца, а ня вучачыся і лапця не спляцеш. У рахунковасьці дробных гаспадарак праўда гэта на столькі, што трэба пакласьці крышку труду пры пачынаньні працы, пры састаўленьні гэт. званай *інвэнтуры*, або йнакш кажачы, пры сьпісываньні усей гаспадарскай маемасьці на пачатку *гаспадарчага году*. Далей усё йдзе „як па масьле."

Гаспадарчы год звычайна не пакрываецца з годам календарным і найчасьцей пачынаецца ад 1-га ліпня. А гэта якраз таму, каб найлягчэй можна было рабіць інвэнтуру гаспадаркі, каторая ў гэту пару бывае найбольш празрыстай, бо ўсякіх запасаў у гаспадарцы цяпер звычайна бывае найменш. Гэтым вельмі аблягчаецца работа.

Састаўленьне інвэнтуры на першы пачатак прадстаўляе некаторыя труднасьці. Але пры добрай волі перамагчы гэта зусім лёгка: трэба толькі сумленна сьпісаць з аднэй стараны ўсё тое, што гаспадарка мае, ці хто ёй нешта вінаваты, а з другой — усё тое, што наша гаспадарка некаму вінавата.

Аб гэтым пытаньні будзем пісаць удальшых нумарох „Самапомачы." Здаём сабе аднак справу з таго, што дарыўчыя гутаркі гэтай справы вырашыць ня могуць. У найбліжэйшай ужо будучыні ўважаем за канешнае сарганізаваць сталае бюро парадаў земляробскай рахунковасьці, якое ня толькі давала-б тэхнічныя парады характару прыватна—гаспадарчага, але і апрацоўвала-б вынікі паадзіночных рахункаводаў для карысьці агульнай. Ці гэткае бюро мусіла б быць не-

---

Voś-ža, kali budziem trymacca henaj navuki, daśviedčanaj viakami, tady staniem budavać chaty tak, kab dreŭny materjał da malejšaj čaścinki byŭ prykryty ad daždžovaj, ci inšaj (hruntovaj) vady i mieŭ volny dostup pavietra. Heta jość zakon budaŭlanaj techniki, i budujučy pavodle jaho, budzie lišnie bajacca chatniaha hryba.

A ciapier: — što-ž rabić kankretna i jak budavać, kab uścierahčy dreŭny materjał ad hnili... a nastupna, ad chatniaha hryba ŭ budynku?

Nieabchodna viedać, što dreva pa svajej natury ŭchłaniaje ŭ siabie vadu i vohkaść, a tak-ža addajeć jaje ŭ suchim miescy. Dziela hetaha treba kab dreŭny materjał na zrub byŭ nia śviežy, a padsušany na volnym pavietry. Na ŭsiu šyryniu padmuroŭki ścielicca prasmaleny tol, jaki maje nie dapuskać praz padmuroŭku hruntovaj vohkaści da padrubu. Padrub abkładajecca na tol. Spod padrubu z abodvuch bakoŭ da pałaviny vyšyni bierviana mažycca smolnaj karbolinaju, jakaja, budučy tonkaj ciečaj, uchodzić hłybaka ŭ dreva, nie zatykajučy jahonych poraŭ (sitavataści), jakimi jano vyparvaje vohkaść. Drenna robić toj, chto mažyć dreva kruhom dziohciem, ci hustoj smałoj, jakaja zatykajeć pory: ad hetaha dreva izolujecca (addzialajecca) ad pavietra, pierastaje dychać i butvieje.

Ścieny ad siaredziny treba rabić hładkija, heblavanyja z pad rubanka, kab nia treba było niaroŭnaści zaleplivać-tynkavać, bo tynku dreva nia lubić. Ščełki ŭ ścianie treba zapaŭniać ki tam na stalarskim kleju, abo razvodnienym hipsam.

Ciapier hałoŭnym zadańniem jość ufundavać draŭlanaju padłohu, a asabliva—padvojnuju. Draŭlany materjał u budynku nie pavinien stykacca z inšym materjałam, jaki trymaje ŭ sabie vohkaść, napr. ziamla, piasok, a asabliva hlina. Belki pad padłohaj nie pavinny datykacca hruntu i musiać być nad im choć-by na 10 centymetraŭ. Kancy belak, kładučy na padmuroŭku, treba pamazać karbolinaju. Padłoha na belkach układajecca ŭ dvajnie: pieršaja (vierchniaja),—čystaja, a druhaja, pad belkami — ślapaja, jakaja kładziecca nižej ad

І на папары трэба гаспадарыць!

Мыляецца той, хто думае, што папар гэта нікуды няварты няўжытак; але ня менш мыляецца і той, хто бязмыснае касаваньне папару называе поступам. І адно і другое ёсьць абмылкай. Праўда знаходзіцца пасярэдзіне: і існаваньне і касаваньне папару могуць быць апраўданымі, а нават канешнымі. Пытаньне толькі — калі, пры якіх варунках?

У даўнія часы, калі голад зямельны гэтак яшчэ не дакучаў, калі наадварот — на вёсцы адчуваўся недастатак рабочых рук, калі людзі ня зналі йшчэ ўдасканаленай земляробскай снасьці, ані ўспамагаючых штучных гнаёў, ані законаў чаргаваньня культурных расьцінаў і калі лік гэтых расьцінаў агранічваўся пераважна да сьцяблёвых толькі збажжавінаў, — у тыя часы пакіданьне поля праз нейкі час папарам людзі апраўдывалі патрэбай „адпачынку“ глебы. Практыка пацьвярджала, што за цану аднагодняга ўраджаю поле пасьля папару быццам сапраўды пачынала больш радзіць і гэта праз даўгія вякі трымала людзей у перакананьні, што папар ёсьць канешнасьцю.

З тым аднак днём, як запасы вольнай зямлі ўсё больш і больш малелі, а людзкая цікавасьць прывяла да пазнаньня, што глеба пад папарам зусім не адпачывае, а прынамся адпачываць ня сьмее ды што ўсе дабрадзействы папару можна замяніць больш акуратнай працай пры помачы дагэтуль няведамай снасьці, пры помачы ўспамагаючых гнаёў, парадку абрабляньня глебы і падборам адпаведнага сяўбовага насеньня, — тады пачалі людзі ад папару ўцякаць, бо ён здаваўся быць занадта дарагім. Папар першапачатны, поўны абочорны, пачаў зьнікаць цалком, або замяняцца на гэтак званы папар летні або зялёны. Гэткі стан трывае на нашых землях дагэтуль. Што аб ім думаць?

На добры лад папар ёсьць явішчам ненармальным. Але сягоньня, калі праца ў земляробстве даўна перастала аплачвацца, у некаторых выпадках, напр. пры нястачы абаротнага капіталу, на глебах цяжкіх, мала абробленых, заросшых пустазельлем — папар можа быць сусім на месцы. Ня можна толькі пры гэтым думаць, што поле пакіненае пад папар будзе сабе „адпачываць.“ Гэтага быць ня можа, бо калі-б зямля пад папарам „адпачывала,“ дык лепш такога папару не пакідаць. Поле пакідаецца пад папар не патое, каб бяздзейна „адпачывала,“ але наадварот, каб працавала.

Як гэта разумець?

Глеба, калі яна мае быць ураджайнай, ня можа быць нечым няжывым. Наадварот, навука даказала, што такая глеба перапоўнена міліёнамі і міліярдамі дробных жывətвораў, г. зв. бактэрыяў, каторыя ў глебе выконываюць працу нейкай вялікай кухні: бак-

---

чым самастойным, ці далучылася-б да нейкай інстытуцыі ўжо існуючай, напр. да Сэкцыі Эканомікі і Статыстыкі пры БІГіК. — пакідаем гэта пытаньне тымчасам адчыненым. Пэўным ёсьць толькі, што гэткая праца вымагае сродкаў матэрыяльных і фахова-людзкіх. Хто мог-бы ў гэтай справе падаць нейкі конкрэтны плян, або і заахвяраваць сваё цэннае супрацоўніцтва, хай захоча зьвярнуцца ў рэд. „Самапомачы“ або проста да ніжэйпадпісанага: кожны будзе шчыра вітаны.

Ад. Клімовіч.

čystaj na 10 centym. Na ślapuju padłohu ŭkładajecca izolacyja ad choładu. Materjałam na izolacyju moža być suchi moch (najlepšy byŭby — tarfiany), kastra, siečka z sałomy, a da ŭsiaho hetaha, jak zaliŭka, dadajecca murarskaja raščyna (vapna z piaskom), kab stvaryŭsia z hetaha niejki adnality suchi plastar. Pavierch hetaha plastra nie pavinien datykacca na paru centymetraŭ čystaj padłohi. Nia dobra robić toj, chto pamiž padłohaŭ kładzie hruz, a asablіva hlinu, jakaja zaŭsiady maje svaju vohkašć stałuju, a da taho dastajecca tudy čas-ad-času vada pry myćci padłohi, i heta vohkašć nasycić materjał dreŭny i stvoryć varunki dla razrostu chatniaha hryba.

Pustoje miesca pamiž padłohaj i hruntam nia možna astaŭlać biez pravievu, bo vyparovanaja z ziamli vohkašć budzie asiadać na belkach i ślapoj padłozie, tvoračy tam hrybnuju pleśniu i hadujučy hryba. Dziela hetaha treba rabić u padmuroŭcy pad usimi ścienami vakoncy pad padłohu (20×20 cm), jakimi skraźniak budzie vyvietryvać vohkaje pavietra i padsušyvać belki z padłohaj. Hryb praviečnaha pavietra najbolš baicca i tam nie zavodzicca.

Na zakančeńnie niekalki słoŭ ab stoli (stalavańni). Belki, na jakich apirajecca stol — treba hładka abheblavać i kłaści tak, kab jany byli vidočny ad siarodku chaty, majučy volny dostup pavietra; nia možna ich ani abšalovyvać, ani atynkovyvać. Doški na belkach treba ŭłažyć tak: pamiž dźviuch daščok musić być prazoryna, a treciaja — kładziecca na henyja doški, zakryvajučy prazorynu. Systemu takoj stoli cieślary nazyvajuć — „nazakład“.

Ścieny chaty z — vonku treba abšalavać, kab jany nia hnili i nia łopali ad sonca. Šaloŭka prybivajecca na łaty, umacovanyja da ścien, kab pamiž ścien i abšalavańniem było pustoje miesca i volnaje pavietra.

Lavon Vitan-Dubiejkaŭski
architekt.



тэрыі гэтыя ператраўляюць і перарабляюць сырэц зямных нетраў на цэнную расьцінную страву. Калі-б у глебе ня было гэтых бактэрыяў дык найбольшыя запасы найлепшай хоць бы расьціннай стравы асталіся-б нявыкарыстанымі. — Вось-жа гэтыя так важныя для ураджайнасьці глебы бактэрыі для свайго жыцьця ў зямлі, акрамя спажывы, патрабуюць яшчэ і вольнага паветра. Калі-ж паветра для іх не хапае, тады яны душацца, гінуць, у глебе наступае бяздзейнасьць, глеба сапраўды „адпачывае", дзічэе, замірае.

Вось-жа заданьнем земляроба і ёсьць падтрымаць у глебе жыцьцё, а рабіць гэта якраз і трэба тады, калі глеба ляжыць пад папарам.

Падтрымка жыцьця ў глебе роўназначна з падтрымкай вышэй успомненых бактэрыяў, каторыя патрабуюць і самай стравы і чыстага паветра. Стравай для бактэрыяў ёсьць органічнае ўгнаеньне (хляўны гной, кампост, зялёнае ўгнаеньне), чыстае-ж паветра ўводзіцца ў глебу пры розных чыннасьцях абрабляньня, як ворка, баранаваньне, спранжынаваньне і г. д. Чым часьцей папар абрабляецца, тым больш глеба праветрываецца, тым больш мусіць ажыўляцца.

У меру таго як глеба ажыўляецца, паўстаюць у ёй усё новыя запасы кармовых сучастак для расьцінаў, каторыя трэба ўтрымаць ад змарнаваньня. Таксама трэба ўтрымаць ад змарнаваньня і запасы грунтавой вады, без каторай расьціны ня здольны былі-б спажываць „на суха" сваю спажыву. Акрамя таго запас вогкасьці ў глебе патрэбны і на тое, каб можна было паправіць будову (структуру) глебы, зьнішчаную (зьбітую) асабліва доўгім гадаваньнем сьцяблёвых збажжавінаў. — Урэшце сваечасным (восеньскім і вясьняным) узорываньнем поля пакіненага пад папар вельмі добра нішчыцца ўсякае прарасшае і нова абышоўшае пустазельле.

Усё гэта ясна паказвае, што пакіданьне поля пад папарам зусім ня знача, што гэта поле мае астацца без дагляду. Наадварот, калі папар мае ўзмацаваць ураджайнасьць поля, дык мусіць быць усьцяж пад пільным даглядам. Поле празначанае пад чорны папар зразу пасьля зьняцьця ўраджаю мелка ўзорываецца (зябліцца) і пры сухой пагодзе зразу барануецца. На восень (прад зімой) поле ўзноў ўзорываецца, але гэтым разам якмага глыбей і пакідаецца на зіму незааранын (у вострай баразьне). Вясной, як толькі абсохне, узноў барануецца, узвозіцца гной (хляўны, або кампост), заворываецца і лёгка барануецца (каб не павыцягіваўся гной). Урэшце чацьвёртая ворка, званая таксама мяшаньнем, ідзе сярэдне глыбокай, але вузкай баразной; усьлед за гэтым прыходзіць баранаваньне і сяўба. -- Для упрашчэньня і большай выразнасьці тут узяты пад увагу толькі плуг і барана. У сапраўднасьці-ж паміж гэтымі дзьвюма чыннасьцямі аснаўнымі могуць здарацца йшчэ чыннасьці часткова ўспамагаўчыя (валачыла, валак), часткова-ж заменныя (напр. драпак). Затое правілам астаецца, каб заворанае поле не аставалася ніколі не забаранаваным. З гэтага правіла ёсьць два выняткі: зусім не барануецца поле заараная прад зімой; пачакаць-жа можна з баранаваньнем і пасьля кожнай воркі, калі яна была выкананай за макра, або калі наагул за зубы бараны ліпне зямля.

Нашто барануем?— На тое, каб пакрышыць пераараную ськібу ральлі, ды каб не дапусьціць да выпароўваньня грунтавой вады. Рэч у тым, што бараной узварушаны верхні пласт глебы мае парваныя ўсе г. зв. валасковыя трубачкі, каторымі ў зьляжалай глебе падымаецца і выпароўваецца грунтавая вада, сусім таксама як у кноце газавай (карасіннай) лямпы падымаецца ўверх і згарае газа (карасіна). Дык няхай ніводнага дня не стаіць не забаранаваным заараная поле (акрамя воркі перадзімовай)!

Але ашчаджаць трэба ня толькі грунтавую ваду, але і самыя кармовыя сучасткі, якія запасяцца ў добра абгаспадараным папары. Гэтыя кармовыя сучасткі могуць спаласківацца ў спод і ад гэтага трудна радзіць, асабліва на лёгкіх грунтох. Затое можна і трэба ратавацца ад стратаў кармовых сучастак, якія пажыраюцца розным дзікарастучым на папары пустазельлем („травой"). Гэткае пустазельле трэба вырываць, а яшчэ лепш — сусім не дапускаць, каб яно там наагул расло.

У канцы канцоў гаспадараньне на папары зводзіцца да ашчаджаньня запасаў зямной вогкасьці і расьцінных кармавінаў. І адно і другое вымагае, каб глеба пакіненая пад папарам не ляжала без дагляду і не парастала ўсякім зельлем. Папар стала мусіць быць пульхным — гэта узбагаціць ягоныя запасы спажыўных кармавінаў, палепшыць будову, і ўсьцеражэ ад стратаў зямной вогкасьці. Чыстае-ж утрыманьне папару ад усякага пустазельля ўсьцеражэ яго ад стратаў самых кармавінаў.

Дык хай-жа нашы папары не ляжаць зьбітыя як ток, ані зелянеюць зманнай зеляньню рознага пустазельля: зьбіты і заселянелы папар трэба зараз-жа ўзварушыць— плугам, спранжыноўкай ці бараной. Цьвёрдыя глыбы можна добра расьцёркі толькі валам, асабліва гэт. званым валам Кампбэля. Толькі добра выраблены папар можа быць у гаспадарцы карысным; папар-жа дзікі, зьбіты, заселянелы (ад пустазельля) гэта гатовая страта.

Папар летні, або зялёны (канюшына!) гэтулькі засьцярогаў ня выклікае і таму аб ім тымчасам не гаворым. А. К.

Новыя гадаўляныя законы.

Закон аб гадоўлі быдла, сьвіней і авец.
(„*Dz. U. R. P.*“ *Nr.40, 1934*).

Ад 15 траўня сёл. ў Польшчы абавязвае новы закон аб даглядзе над гадоўляй быдла (скаціны), сьвіней і авец. Галоўныя пастановы гэтага закону наступныя: —

Дагляд над гадоўляй быдла, сьвіней і авец выконвае Земляробская Палата, якая вядзе пляменныя кнігі і выдае пасьведчаньні аб радаводах. Спэцыяльная ўвага зьвяртаецца натуральна на расплодны матэрыял. Чужыя каровы, сьвіні і авечкі можна пакрываць толькі такімі расплоднікамі, якія вызначаны для данага гадаўлянага вокругу. Век расплоднікаў: для бугаёў (быкоў) ня можа быць меншы 10 мес., для кнуроў — 6 месяцаў, для бараноў —3 мес. Расплоднікаў-самцоў выбірае толькі адумысловая гэт. зв. кваліфікацыйная камісія. Кожны, хто мае самца-расплодніка, павінен яго запісаць у гміне і прывадзіць (прывазіць) на абвешчаны перагляд кваліфікацыйнай камісіі.

Аб забесьпячэньні патрэбнай колькасьці расплоднікаў мае старацца гмінны і паветавы самаўрад. На закуп расплоднікаў дае грошы: казна 10 прац., паветавы самаўрад („соймік) — 25 прац. і рэшту — 65 прац. мусяць пакрыць самі зацікаўленыя гадаўцы жывёлы.

Чужую жывёлу можна пакрываць толькі такім самцом-расплоднікам, каторага прызнае здатным кваліфікацыйная камісія. Гэта-ж камісія можа для прыватнага ўжытку гадаўца пакінуць і такога самца-расплодніка, каторы ня здатны для ўжытку публічнага. Але такога расплодніка можна ўжываць толькі ў сваёй прыватнай гаспадарцы ды за іх можа быць устаноўлены на карысьць Земл. Палатаў і гмінных самаўрадаў наступны гадавы падатак: за бугая — 50 зл., за кнура — 25 зл. і за барана – 10 зл.

За нестасаваньне гэтых законных пастановаў гразяць грашовыя кары.

Да 20 цёх зл. штрафу караны будзе той

1. хто не запісвае ў гміне расплодніка, або не вядзе яго на перагляд кваліфікацыйнай камісіі.

2. хто дапускае магчымасьць пакрыцьця няпрызнаным расплоднікам чужых кароваў, сьвіняў ці авец.

Да 300(трохсот) зл. штрафу караны будзе той

1. хто пакрывае няпрызнаным расплоднікам чужую карову, сьвіню ці авечку,

2. хто бяспраўна вядзе кнігі племнай гаспадарскай жывёлы і выдае радаводы і пасьведчаньні,

3. хто бясправна называе сваю жывёлу племнай.

Закон аб гадоўлі коняў.
(„*Dz. U. R. P.*“ *Nr.32, 1934*).

Ад дня 1 ліпня сёл.ўваходзіць у сілу таксама новы закон і аб гадоўлі коняў. Паводле гэтага закону Земл. Палаты, або з Мініст. Земл. ведама таксама прыватныя гадаўляныя таварыствы вядуць племныя і гадаўляныя кнігі і выдаюць пасьведчаньні аб паходжаньні жывёлы.

Міністэрства земляробства, у паразуменьні з мініст. спраў вайсковых азначвае вакругі, дзе і якія расы коняў маюць гадавацца. На падставе гэткага падзелу гадаўляных вакругоў, кваліфікацыйныя камісіі ня могуць зацьвярджаць да публічнага ўжытку найлепшых хоць-бы племнікаў тых расаў, каторыя ў гэтым вокрузе ня прызнаны міністэрствам.

Уласьнікі трыгадовых і старшых жарабцоў павінны запісаць іх у гміне і вясьці да перагляду кваліфікацыйнай камісіяй.

Пакрываць чужыя племныя штукі можна толькі такімі расплоднікамі (жарабцамі), каторыя будуць прызнаны кваліфікацыйнымі камісіямі на сумысных раённых праглядах. Для прыватнага ўжытку можна ўжываць расплодніка і такога, каторы ня прыгодны для ўжытку публічнага; толькі ўласьнік такога расплодніка-жарабца абкладаецца гадавым падаткам у суме 50 зл. за штуку.

Коні запісаныя ў племныя кнігі звальняюцца ад надзвычайных самаўрадавых падаткаў, а таксама і ад шарваркаў, калі ўласьнік аплаціць роўнавартасьць паводле ўрадавай таксы. Калі ўласьнік племнай конскай штукі іншага каня ня мае, тады гэта племная штука зусім звальняецца ад абавязку шарварку.

Незастасаваньне гэтага закону будзе карацца грашовым штрафам. Да 300 (трохсот) зл. штрафу будзе плаціць той, хто чужую кабылу пакрывае жарабцом няпрызнаным кваліфікацыйнай камісіяй. Да 20 зл. штрафу будзе плаціць той, хто дапускае магчымасьць, што ягоная кабыла будзе пакрыта жарабцом няпрызнаным кваліфікацыйнай камісіяй; хто не запісвае ў гміне жарабца ад трох гадоў уверх, або хто запісанага жарабца не вядзе на перагляд кваліфікацыйнай камісіі.

Расплоднікаў няпрызнаных кваліфікацыйнай камісіяй гаспадар мусіць кастраваць (лягчыць). Хто гэтага ў азначаным часе ня зробіць самавольна, таму гэта можа зрабіць улада адміністрацыйная (паветавае староства) на кошт самога-ж гаспадара.

* * *

Законы гэтыя, пэўна-ж, імкнуцца да ўпарадкаваньня і падняцьця жывёлагадоўлі. Але самыя законы, хай яны будуць найлепшымі, ніколі да мэты не давядуць, калі самі гадаўцы не зацікавяцца справай, калі не зразумеюць яе, як сваю ўласную карысьць. Да гэтага аднак ня йдзём, бо агульны кірунак гаспадарчай палітыкі хутчэй забівае прыватную гаспадарчую ініцыятыву, чымся яе падпіраць.

Б. В.

Шкоднік пядзямер.

(*Cheimatobia brumata*).

Яшчэ ў добрай памяці леташнія страты ў садох, дзе замест зялёных дрэваў асталіся голыя сукі, а тут і сёлета з шмат мясцоў, пераважна тых самых што і летась, наказваюць нам аб тых-жа шкодніках і тых-жа выніках. Усё гэта робіць гусьвіца (рабак) пядзямера, званага так дзеля таго, што перасуваючыся з месца на месца выгібаецца лукам, падцягваючы зоднія ногі пад сам перад, як быццам мерыла пядзі. Належыць пядзямер да найпрыкрэйшых „гасьцёў“ у фруктавым садзе, бо **аб'ядае пупушкі** (покаўкі), **лісты і маладыя плады**. Небясьпечнасьць ягоная тымбольшая, што раз дастаўшыся ў сад, уступае стуль толькі тады, калі супроць яго стасуюцца якія— небудзь абаронныя меры.

Гусьвіца пядзямера гэта зелянкавы, з сьветлымі ўздоўж цела паяскамі рабак, з дзесяцьцю нагамі. Па дрэве пераходзіць „пядзямі,“ а з сука на сук і на зямлю спускаецца ў павучыньні. Спусьціўшыся на зямлю гусьвіцы дасьпяваюць у крылатых самцоў і бяскрылых самак.

Шкоднасьць пядзямера усім зразумелая і таму яго трэба нішчыць усюды і заўсёды. Найдапаведнейшым аднак да гэтага часам ёсьць той мамэнт, калі дасьпелая самка выходзіць у дарогу класьці яйкі. Робіць яна гэта не на зямлі, але на дрэве, куды і выпраўляецца пехатой, бо, як было сказана, крылаў ня мае. У беларускіх кліматычных варунках гэта бывае каля 10 кастрычніка, і ў гэту пару трэба самак лавіць і нішчыць. Робіцца гэта пры помачы ліпкіх паясоў, шырынёй у 15—20 см., шчыльна накладаных на камёл фруктовых дрэваў. Істота гэтага спосабу барацьбы ў тым, што самкі шкодніка пядзямера, паўзучы ўверх па дрэве напатыкаюць па дарозе ўспомнены ўжо ліпкі пояс, самі на яго прыліпаюць і гінуць, а дрэва адратоўваецца такім чынам ад непажаданага „падарунку,“ з каторага на будучы год вырасла-б новае пакаленьне пражорлівых гусьвіцаў.

Ясна, што ўдача гэтага спосабу абароны проці пядзямера будзе залежыць ад: 1. адгаданьня часу, калі самкі пядзямера адпраўляюцца ў дарогу, каб злажыць яйкі, 2 ад шчыльнасьці і наагул дакладнасьці залажэньня ліпкага пояса, 3. ад гатунку ліпкай масы, якой націраюцца абаронныя паясы і 4. ад сталага кантраляваньня ліпкасьці гэтай масы.

Час або пару накладаньня ліпкіх паясоў у нашых варунках азначаюць больш-менш каля 10 кастрычніка.Адзін год гэта пара можа параніцца, а другі — прыпазьніцца. Гэта вымагае, каб уласьнік саду ўжо ад канца верасьня пільна сачыў, ці не вандруюць ужо ўверх па дрэве якія самкі і калі так, дык мусіць успоўсшых ужо паськідаць, і на дрэве, ня высока, залажыць ліпкі пояс.

Закладаньне пояса — важная рэч. Прадаюцца гэтыя паясы гатовыя, але іх часта лепш прыгатаваць самому. Бярэцца на гэта аркуш паперы ўшырку на 20 см. і шчыльна абкручываецца каля кары. Калі ў нейкім месцы кара няроўныя, дык яна асьцярожна нажом зразаецца і раўняецца; а калі пад апаяскай здарыцца большая ці меншая шчэлачка, дык яна залепліваецца глінай, кітам ці нечым падобным. Гэтак наложаную апаяску абмазваюць якой-небудзь ліпкай масай, але не на ўсю шырку, а толькі пасярэдзіне няшырокім і нягрубым паясом.

Наложаныя і абмазаныя апаяскі ня можна аднак пакідаць без дагляду; раз што самі паясы могуць сапсавацца ці і сусім апасьці, а другое — найлепшая нават ліпкая маса пры добрай (ня лішне сухой і ня мокрай) пагодзе з часам або сохне, або змываецца, або ўрэшце і незасохшы і нязмыты клей, калі шмат на ім налепіцца ўсякіх мошак, дык яны самі твораць ужо быццам пьмост, на каторым дальшыя шкоднікі могуць „сухой нагой“ пераходзіць і падымацца ўверх: у такім выпадку трэба або паправіць апаяску старую, або замяніць яе зусім новай. Гэтак устроеныя і дагледжаныя апаяскі бароняць садовыя дрэвы сусум добра.

Акрамя гэтага способу, ёсьць яшчэ спосабы іншыя. Вясной, як толькі дрэвы адцьвітуць, іх спырсківаюць расьцечай гэт. званай парыскай зелені. Ёсьць гэта зялёны парашок — сільная атрута, які мае ў сабе медзь і аршэньнік: ня можна яго ўдыхаць, ня можна таксама і браць у рот. Ужываецца парыская зелень гэтак: насамперш дадаецца да парашку зелені крыха вады і робіцца з гэтага цеста, без камкоў. Пасьля асобна прыгатаўляецца гэт. зв. вапнянае малако: на 100 літраў „малака“ бярэцца ў кошык 6 кілё добра перапаленай чыстай вапны і затопліваецца на хвільку ў ваду. Кошык пасьля прыкрываецца плахтамі. Вапна распадаецца на дробны парашок. Вапну гэткую зараз-жа заліваюць вадою, а прад ужываньнем перацэджваюць.У начыньне з цестам парыскай зелені уліваецца пасьля вапнянае малако, старанна і стала перамешваецца, каб зелень сама не апала на дно — і спырсківаецца. Для малодшых дрэваў і кустоў ужываецца паводле Д-ра Стравінскага наступная мешаніна „зелені:“

Парашку зелені	. . . . .	10 грам
Вапны нягашанай	. . .	.20—30 „
Вады	. . . .	12 літр.

Для дрэваў старэйшых порцыя парашку зелені і вапны можа быць удвая большая, чым вышэй паказана.

Урэшце дзеля тэй-жа мэты нішчэньня пядзямера ў зямлі, увосені перакопываецца ці пераворываецца зямля паміж дрэваў.

З усіх гэтых способаў відаць, што няма ніводнага, якога можна ужываць цяпер улетку, калі пядзямер якраз і шкодзіць. Але „не тады сабак карміць, як на паляваньне трэба йсьці:“ хто хоча аднак мець з саду карысьць,

той мусіць аб гэтым памятаць: **з восені** — закладаць абаронныя паясы, перакопываць зямлю, **узімку**—зьбіраць і паліць сухое лісьцё і адтрэсканую кару, асабліва калі ўсё гэта абмотана павучыньнем і **вясной**—спырсківаць адцьвіўшыя дрэвы расьцечай парыскай зелені. С. Я.

Яблынная моль.

Hyponomeuta malinella.

І гэта так-жа вялікі шкоднік, перадусім дрэваў яблынных, ад чаго і мае свой назоў. Дрэвы нападзеныя ім выглядаюць гэтак:

Лісьцё, а часам і цэлыя галінкі паабматаны павучыньнем. Творацца гэтак гнёзды, у каторых знаходзіцца вялікае мноства жоўтых, чорна накрапляных, каля 2 см. доўгіх гусьвіц (рабачкоў). Разлазяцца яны з гнязда па ўсім дрэве, абжыраючы да чыста ўсё лісьцё. Некаторыя з іх на павучыньні спускаюцца на зямлю і з іх пасьля выклюнуцца маленькія рабенькія мятлікі, што ў Пятроўку лятаюць начамі і складаюць на дрэвах яечкі, па 50 штук у жоўтых, пасьля рудзеючых кругох. З гэтых вось яечак на другі год у пачатку мая і выклюваюцца тысамыя шкоднікі, якія ўжо ў канцы мая і далей і абжыраюць усю зелень садоў.

Дрэва нападзенае яблыннай моляй ня родзіць ня толькі ў той год, але і на наступны, а нярэдка і сусім высыхае.

Нішчыць яблынную моль найлепш яшчэ зімой і раньняй вясной, зьбіраючы старанна з кары накладзеныя туды яечкі молі. Перад распусканьнем пупушак на дрэве, спырсківаюцца яны расьцечай парыскай зелені. У разе, калі ў свой час (узімку і вясной) яечкі моляў ня былі зьнішчаны і гусьвіцы іхнія расьпаўзуцца па ўсім дрэве, дык не астаецца нічога іншага, як зьбіраць іх рукамі, або таксама спырсківаць парыскай зеленьню. Спырсківаньне гэтае цераз 10 дзён паўтараецца. Урэшце куклы моляў, закручаныя ў павучыньне, зьбіраюцца разам з лістамі: ў гэткіх гнёздах налічваюць па 600—800 штук куклаў. С. Я.

Пчалярскі лемантар.

Не лакомцеся на мёд.

У нас так завялося, што пачынаючы пчаляр, ледзь толькі прыдбае пару калод пчол, у першую чаргу стараецца іх выкарыстаць як толькі можа, каб нешта ды зарабіць. Такі пчаляр ня ведае напэўна ані ўмоваў пажытку, ані стану данае калоды, ані жыцьця пчалы — а ведае толькі адно як выбіраць мёд... і выбірае ўсё на чыста. Канец з гэтага такі, што пчолы пачынаюць слабець і нават да зімы йшчэ гінуць, а пчаляр такі звалівае тады віну на самых пчол, на пагоду, на ваколіцу і г. д. Не, прыяцелі, ня будзьце прагавітымі, навучэцеся сьпярша ўмела даглядаць пчолы, прыглядвайцеся да калодаў і разважайце, якія маглі-б быць карысьці з вашае ваколіцы, рупцеся, каб вашыя калоды былі моцнымі і лепш хай лішні мёд астанецца для рою які зробіце, каб павялічыць пасеку.

Не рабеце шмат раёў.

Другая важная абмылка пачынаючых пчаляроў, гэта імкненьне, каб мець як мага больш штучных ці натуральных раёў. Часта пчаляр так шмат іх наробіць, што як маладыя раі, так і калоды матчыныя робяцца нічога ня вартымі — усе да вясны не дажываюць, бо ім няма чаго есьці, ані як грэцца. Помнеце, што пачынаючаму толькі з 2-х сільных пнёў можна рабіць адзін сільны рой, які патрапіць назьбіраць сабе мёду на зіму. Калі-б вы з двух зрабілі яшчэ два, тады мусіце ім даць і цэлую вашчыну (або суш), а таксама і мёду ці цукру яшчэ перад восеняй. Аднак не забывайцеся, што моцны пень лепш зімуе і ў параўнаньні да сілы — менш зьядае мёду. Раі трэба рабіць толькі раньнія, да палавіны ліпня найдалей. Позныя раі давясьці да мэты цяжэй.

Як зрабіць штучны рой.

Ёсьць некалькі спосабаў, як гэта рабіць, аднак найлягчэйшыя ёсьць два: рой складанец і рой ссыпанец. Рой **складанец** робяць адзін з 2—3—4 сільных пнёў. Дзеля таго ў харошы пажыткавы дзень да 12 гадзіны зрабеце так: прыгатоўце пусты вулік, улажэце ў яго пару рамак сушы, а калі ня маеце, то штучнай вашчыны. Той пусты вулік пастаўце блізка каля найсільнейшага пня. Тады трэба сільны пень падкурыць і ўзяць з яго 2 рамкі з крытым чэрам і пчоламі. Да рамак трэба добра прыглядзіцца, ці няма на іх часам маткі. Калі пераглядзіце, улажэце іх у пусты вулік і лёганька накрыйце з верху мяшком. Ідзеце да другога сільнага пня, таксама падкурэце і вазьмеце з яго 1 рамку з крытым чэрам, устаўце ў пусты вулік, але трохі далей ад папярэдніх.

Другую рамку з чэрам з таго-ж вуліка прынясеце да пустога і строшы з яе ўсіх пчол, якія на ей сядзелі, занясеце назад у свой вулік. Тое самае зрабеце з трэцім, а як ёсьць то і з чацьвёртым. Кожны раз рамкі і пчолы з іншага пня кладзеце трохі далей ад другіх. Рой цяпер знаходзіцца ў такім стане: 2 рамкі сушы, 4 рамкі чэру закрытага і някрытага з пчалою і яшчэ маладых пчол са 2—3 рамкі. Цяпер усіх пчол у новым вуліку трэба яшчэ падкурыць, каб яны набраліся мёду, ды каб прасяклі дымам і адным духам. За якіх 5—10 мінут пастулівайце ўсе рамкі да сябе на сярэдзіне і добра ўкрыйце гняздо падушкай саламянай або мяшком і матамі. Перад тым аднак трэба зірнуць на

рамкі і на дно вуліка, ці няма там кучкі пчол, падобнай да гарэху або яблыка. Калі б так было, дык гэта знак, што вы неасьцярожна ўзялі рамку з маткай і яе душаць чужыя пчолы. Тады зараз-жа бярэце тую грамадку пчол лёганька рукою і пырскніце на іх вадой, або хоць і сьлінай, каб уратаваць матку. Матку замкнеце ў клетачку (матачнік) і пастаўце на сярэдзіне паміж рамкамі, а калі знаеце з якога яна вульля, то вярнеце яе тым пчолам. Калі-б маткі ў гэтым складанцы ня было, тады добра было-б, каб вы на сярэдняй рамцы якойсь выразалі кусочак вашчыны, каб было месца пчолам збудаваць матачнікі для будучай маткі.

Такі рой будзе мець толькі маладых нялётных пчол, і ім у рамку сушы трэба даць вады. Але можна зрабіць гэта карацей: адсуньце найсільнейшы пень на якога паўмэтра ад старога свайго месца, а гэты новы з роем умясьціце ад таго старога месца так, каб пчолы, што варочаюцца з мёдам з поля, разьдзяляліся на два вулікі: стары і новы рой; тады і ваш рой будзе мець лётных пчол і ня трэба яму будзе вады.

Рой ссыпанец робяць так: бяруць райніцу, выймаюць з кожнага сільнага пня 1—2 рамкі дзе ёсьць чэр (крыты і някрыты), глядзяць ці няма маткі і ўсіх пчол з рамак страсаюць у райніцу ў адну грамаду. Пчолы старыя ўцякуць у свой вулей, а ўсе маладыя астануцца ў райніцы. Калі натрасіцё пчол са два кілёграмы, то ўсыпце іх у новы вулік на рамку з маладым чэрам і яечкамі з найлепшага пня ў пасецы. У рамцы пад яечкамі выражце дзірку для матачнікаў, а пчолам наліце ў рамку вады.

(З „Укр. Пас.“).

Як я зьбіраю і асаджваю рой.

Кожны пчаляр інакш зьбірае раі; адзін страсае з галінкі ў райніцу, другі зьмятае пяром ці шчотачкай, а трэці проста асьцярожна абразае галінку дрэва з роем і г. д. Я таксама зьбіраў раі рознымі спосабамі, аж да таго часу, пакуль мне рой не асеў на плоце. О, тады было хоць купі мудрасьці... І прышло мне на думку, што пчолы вельмі ахвотна лезуць у якое-небудзь дупло і ўверх. Я знайшоў драўляную дзежачку ад сыра, нашмараваў яе ўсярэдзіне мёдам і прыставіў дагары дном у тое месца, дзе асеў рой, а знізу плоту падкурыў лёгка дымам і рой палез у тую дзежку, падобна як у вулік, не спраўляючы мне ані крыху труднасьці. З гэтага прыкладу я зрабіў сабе райніцу, у якую заўсяды лёгка і скора зьбіраю раі з усякага месца.

Райніца зроблена з саломы, моцна сшыта лыкам, падобная да звана. За дно райніцы прычэплена пятля, якой прывязваю яе да канца тычкі і вешаю дагары дном над роем зьверху. Каб рой ахватней лез у райніцу, да дна яе ўсярэдзіне прычэпліваю кусок вашчыны з мёдам. Райніца мусіць дакранацца да клубка рая так, каб пчолы не пералятаючы маглі лезьці ў райніцу. Тады знізу пад рой пускаю пару клубоў дыму з падкурача і пчолы рухаюцца з месца, падымаюцца ўверх у райніцу і чапляюцца да дна райніцы падобна як у вульлі. Калі пчолы асядуць, спускаю райніцу ўніз, перанашу да вуліка, адчыняю яго, стаўлю масток, кладу на яго райніцу адкрытым бокам да вульля. Пчолы падкурываю ўзноў дымам праз дзірку ў дне райніцы і яны хутка пераходзяць у вулік... *К. К.*

Ад рэдакцыі. Іншыя пчаляры зьняты ці сабраны ў райніцу рой не перасыпаюць зразу ў вулей, а трымаюць пчол у райніцы да вечара. Вечарам-жа ўпушчаныя ў вулей пчолы лепш асядаюць і хутчэй асвойваюцца.

Як нішчыць мурашкі ў вульлі.

1. Пасыпце дробна-тоўчаным цукрам груба дзюркаваную губку да мыцьця і папажэце яе ў вулей ці каля яго. Як мурашкі абсядуць губку, кіньце іх у гарачую ваду, а як абсохне — паўтарэце.

2. Перарэжце мурашкам дарогу да вульлёў, паліваючы яе сьвежай гнаёвай жыжкай, карболевым квасам ці карболінэумам, або пасыпце яе дзеравяным попелам, крэйдай, сажай або раскрышанай на парашок вапнай.

3. Зруйнуйце гнёзды мурашак газай, серкавым пылам.

Найлепшы скутак асягаецца зруйнаваньнем гнёздаў і адгараджэньнем дуступу да вульлёў рознымі перашкодамі (напр. дзёгцем — *пераклад.*). Там дзе напад мурашак асабліва небясьпечны (напр. у паўдзённых краёх), там абводзяць пасеку бэтонавым ровам, у каторы наліваюць карболінэум...

(Паводле „*Bienen-Vater*“).

Як гаспадарыць малаком чэская гаспадыня.

(Працяг, гл. „Самапомач“ № 5 с. г.)

Сьмятану студжу пры цэнтрыфузе, а пасьля зараз вынашу ў склеп, у ваду, дзе згусьцеўшай сьмятаны ніколі на ўласную патрэбу ані крыхі не бяру, каб не рабіць паверх сьмятаны большым, як канешна быць мусіць. На штодзенную патрэбу сьмятаны мушу памятаць пры цэнтрыфугаваньні. Узімку трэба зьбіваць масла ў памешканьні цёплым, у маім выпадку ў кухні, улетку—ў сьцюдзёным. Тры гадзіны прад зьбіваньнем бяру сьмятану ў тое памешканьне, ў каторым б'ю масла, улетку стаўляю гаршкі з сьмятанай у балею, у каторай знаходзіцца на дробна патоўчаны лёд. Масельніцу (бойку) ўзімку спаласківаю гарачай вадой, а пасьля пераліваю сьцюдзёнай. Улетку наліваю поўную масельніцу сьцюдзёнай вады, дадаю да яе йшчэ лёду і халаджу яе гэтак праз тры гадзіны. Узімку зьбіваю

сьмятану абагрэтую на 16° Ц, улетку — на палову ніжэйшую (каля 8°)... Перш чым уліць сьмятану ў масельніцу, прагледжу добра, ці там няма якога бруду, які мог-бы туды мімавольна дастацца... Зьбіваю спачатку памалу, пасьля хутчэй, а пры канцы ўзноў памалу. Зьбіваю за 20—30 мінут, залежа ад цяплыні сьмятаны і памешканьня. Калі каровы ня кормяцца ніякэй зялёнай пашай, тады прад зьбіваньнем дадаю да сьмятаны крыху хварбы, якую купляю ў аптэчным складзе. На 1 літр сьмятаны даю 4—5 капляў; масла мае пасьля хорашы жоўты, крэмавы колер. — Калі ўжо масла зьбілася і сабралася ў кусок, выпускаю з масельніцы масьлянку, а на масла налліваю двойчы гэтулькі вады, колькі было сьмятаны і старанна перамываю.

Да гэтага месца ўсю работу рабіла асоба нанятая; цяпер аднак прыступаю да працы з а ў с я д ы я с а м а. Рукі старанна вымываю, голаў зьвяжу хусткай Вымаю з бочкі (масельніцы) кускі масла, выціскаю з іх ваду і разважываю. Пасьля кладу масла ў начыньне з вадой і ўважна выціскаю ,каб у масьле не асталася ніводная капля масьлянкі або вады, уціскаю ў дзераўляную хворму, аздобленую вырэзанай галінкай канваліі, выбіраю і кладу ўзноў у іншую судзіну з вадой. Гэту працу выконваю з пачуцьцём радасьці. Масла — золата нашых гаспадарак — найпрыгажэйшая, падлягаючая хвармаваньню маса, у пальцах маіх пераменьваецца ў бясконцыя хвормы і падабенствы, а мне здаецца, што стаюся рэзьбяром, працуючым над боскім творам, каторы падам чалавецтву як няштодзенную спажыву, асаблівы прысмак, цудоўны лек.

Б'ю масла заўсяды дзень прад тым, як пасылаю яго на продаж. У вадзе масла сьцьвярдзее, хворма астанецца непарушнай. канты ня сьціснуцца. Закручываю толькі ў белую чыстую паперу, якая ніколі ня сьмее быць зжаўцеўшай ці пашарэўшай. На паперы выціскаю штэмплем сваё імя—прозьвішча:

Ia. selske maslo Marie Čižkove, Vrbčany

Паперу рэжу на даволі вялікія кускі, каб масла магло быць хораша ўкручана (8 частак з аркуша). Гадзіну больш-менш часу прад запакоўваньнем вымаю масла з вады, каб папера каплямі прыстаўшымі да масла за надта не прамокла і ня скорчылася, бо было-б гэта на шкоду выгляду масла. Усім гаспадыням раджу даваць маслу хворму чатырохкутную. Гэтак ухварманае масла выглядае большым кавалкам, чым масла бяз хвормы, або ў хворме круглай. Хто йдзе з маслам на торг, няхай на пробныя пакаштункі возьме адзін асобны кусок, рэшту хай не пазваляе распакоўваць, бо ўзімку скрэпшымі пальцамі паперу ўжо так не закруце, а ўлетку без патрэбы дасьць доступ да масла сонцу, цяплу і пылу. І адно і другое шкодзіць выгляду масла, а тымсамым і куплі.

Пры канцы дадам, што гэтак паступаю пры вырабе масла ў сваей гаспадарцы ўжо дзесяць год і пры цэнах добрых і благіх дастаю на 4—6 кронаў за 1 кілё больш, чым на рынку. Хто маё масла раз пакаштаваў, становіцца сталым яго набыўцом, а спажыўцы пры спатканьні ня скупяцца з словамі прызнаньня і пахвалы."

Канец

Як зьбіраць і прыгатаўляць грыбы.

Беларусь — гэта край ня толькі лясоў, але і грыбоў, ягад і ўсялякіх зёлак. Застановімся тут над самымі толькі грыбамі, а іменна над смаршчкамі і баравікамі.

З грыбоў можна мець і добры даход, а асабліва ў тых мясцовасьцях, дзе ёсьць многа лесу, а грунт для земляробства ня прыгодны. Але, нажаль, мы ня ўмеем як належыцца зьбіраць і даглядаць грыбоў і затым многа трацім, бо ў абароце гандлёвым грыбы блага прыгатаваныя, папаленыя, паламаныя — ня цэняцца. А затым, каб з грыбоў выцягнуць як найбольшую карысьць і як найменш скрыўдзіць таго, хто гэтыя грыбы зьбірае і хто іх спажывае, трэба перасьцерагаць ніжэй пададзеныя правілы.

Як мы ўжо ўспаміналі, да сушэньня годзяцца толькі смаршчкі і баравікі.

Усе добра ведаем выгляд с м а р ш ч к а, а затым пераходзім адразу да

а) З ь б і р а н ь н я с м а р ш ч к о ў. Смаршчкі пачынаюць расьці ў нас раньняй вясной, г. зн. больш-менш у пачатку красавіка і растуць да канца траўня. Некаторыя гатункі смаршчкоў паяўляюцца і восеняй.

Зьбіраючы смаршчкі трэба зразаць іх пры корані ножам так, каб корань быў кароткі, зусім чысты, г. зн. без зямлі і якогась там моху, і старацца, каб не пакрышыць смаршчка. Ня трэба таксама шмат смаршчкоў класьці ў адзін кошык, бо яны крышацца і цана іх будзе меншая. Сабраныя так грыбы трэба адпаведна перабраць: меншыя прадаць сырымі, а большыя — сушыць.

б) С у ш э н ь н е. Найлепш сушыць смаршчкі на сонцы і ветры. Дзеля гэтага трэба ўзяць дзераўляныя рамкі і нацягнуць на гэтыя рамкі драцяную неаржавую сетку. Сырыя смаршчкі трэба класьці на сетку адзін каля другога, але ня можна класьці смар-

Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ

Bielaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 1—3.

шчка на смаршчок, бо і ня так скора яны высахнуць і да таго могуць пацёрціся. Такія вось сеткі з грыбамі трэба класьці на мясцох найбольш ветраных і высака над зямлёй, каб усьцерагчы прад пылам, пяском і г. п. брудамі. Можна сушыць смаршчкі нанізаўшы іх на грубейшыя ніткі лянныя ці канапляныя (вянкі). Вянкі такія вешаюцца на чыстых пруточках і да таго таксама на сонцы і ветры Нізаць смаршчкі на ніткі можна праз корань (уздоў-ж) і шапачку або ўпоперак карэрьчыка і такі спосаб ёсьць лепшым, бо шапачка застаецца цэлай.

У печах сушыць смаршчкі (а ў нас бадай толькі гэтак і робяць) ня радзяць, бо іх можна лёгка перасушыць, папаліць, пэпэцкаць у попел. У печах можна толькі дасушываць тыя смаршчкі, што ня зусім яшчэ высахлі на сонцы, Дасушываючы смаршчкі трэба іх класьці на тоненька ў печы насланай саломе, каб грыб не пабрудзіўся попелам.

в) Сартаваць смаршчкі высушаныя трэба так, каб асобна класьці грыбы большыя, цямнейшыя, добра высушаныя, бяз попелу і г. п., а асобна меншыя і яськейшага колеру.

г) зрабіўшы такі падзел з смаршчкамі і высушыўшы на сетцы ці ў вянку, трэба прад высылкай запакаваць іх у невялікія кошыкі ці карзінкі, берагі і дно якіх трэба заслаць чыстай незадрукаванай паперай (найлепей пэргамінавай). Гэтак абаронім грыбы перад запыленьнем і намачэньнем.

д) Смаршчкі высушаныя павінны перахоўвацца ў чыстым, сухім, выбраным месцы. Не пераховываць там, дзе ёсьць вільгаць.

(д. б.) Б. Ю.

Гаспадарчая хроніка.

10-гадоў існуе ўжо пры Віленскім Унівэрсытэце Аддзел Земляробскі. Угодкі гэтыя сьвяткаваліся ў Вільні 27 траўня сёл. Пачаткі Земл. Аддзелу (гэтак зван. „Студыюм“) былі зроблены ў 1923—24 г. Ініцыятыва сарганізаваньня земл. Аддзелу належа да Аддзелу прыр. — матэматычнага гэтага-ж віл. унівэрсытэту, які ў 1924 г. устанавіў катэдру Прадукцыі расьціннай. На гэту катэдру, а таксама і на першага дырэктара „Студыюму“ быў пакліканы праф. К. Рогойскі. Да 1928—29 г. „Студыюм“ меў толькі два ніжэйшыя курсы; ад гэтага-ж 1928—29 году „Студыюм“ было дапоўнена двума курсамі вышэйшымі, так што сягоньня творыць ужо закончаную цэласьць.

Да сягоньняшняга дня Аддзел Земляробства пры Віл. Унівэрсытэце скончылі з тытулам інжынера 33 чалавекі (27 мужчын і 6 жанчын). Сёлета лічыцца на Аддзеле 156 студэнтаў (107 мужчын і 49 жанчын). Дырэктарам Аддзелу ў сёлетнім акадэмічным годзе зьяўляецца праф. Э, Лелеш.

Аддзел да гэтай пары яшчэ ня мае права асобнага факультэту і зьяўляецца фактычна пададдзелам факультэту прырода-матэматычнага.

Карысnасьць гэтай пляцоўкі на нашых землях мусіла-б быць відавочнай сама з сябе. Ці так ёсьць аднак у сапраўднасьці — сказаць тымчасам трудна. А гэта дзеля таго, што як сярод прафэсарскага пэрсоналю, так і сярод студэнства лішне глыбака йшчэ сядзіць традыцыя засьценкаў, хваліваркаў і двароў і за мала (вельмі мала!) зьвяртаецца ўвага на дастасованьне здабычаў агранамічнай веды да варункаў дробнага перадукім нашага беларускага селяніна.

А бяз гэтага поступ у нашай гаспадарцы немагчымы!

Наша пошта.

Матэлёнак Я:—Падпіску на дзесятку „Самапомачы“ атрымалі і часопісь (у двух часьцях) выслалі: ці атрымалі?

Кнігарні: „Добро“ і Gebethner-Wolff“ у Варшаве. „Самапомач“ будзем Вам ст а ла пасылаць.

Кенд. В: Паводле „старога“ закону аб коопэратывах Суд мусіць зарэестраваць статут, калі прыняўшы яго не дае ніякага адказу ў працягу двух месяцаў. Больш напішам Вам аб гэтым, як атрымаем весткі з самога Суду. Што ў Вас новага?

Бернацкі Ул. і Курылёнак М. Курс коопэрацыі пры рэд. Самапомачы каштуе 16 зл. (у расстрочку — 21 зл.). Запішэцеся ў м-цы верасьні.

Шышкоўскі Я: З апісаньня відаць, што гэта будзе Яблынная моль: прачытайце аб ёй у сяньняшняй „Самапомачы.“ — Ліпкія паясы проці пядзямера можна рабіць самому, а можна і купляць гатовыя. Выробляе іх фабрыка „Avenarius“ і „Azot.“

В. А—чанка: Аб зьбіраньні і прыгатаўляньні грыбоў пісала „Самапомач“ летась (№ 5—6), а ў наступным нумары будзе зьмешчана і сёлета. — Аб жывакосьце як добрай пашы перадусім для сьвіней, знойдзеце таксама ў леташнім гадавіку „Самапомачы“ (№ 9—10, на бачыне 59-ай). Калі гадавіка гэтага ня маеце, дык можам Вам яго выслаць; каштуе ўсяго тры залатоўкі, разам з перасылкай.

Вас. Засім: Малачарскія курсы што год ладзіць украінскі „Масласаюз“ (Львоў, вул. Б. Гловацкага № 23.

Pierasyłka apłačana ryčałtam.

CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ